# НЕКАТОРЫЯ ЗАЎВАГІ АБ ПРЫНЦЫПАХ НАВУКОВАГА ГІСТАРЫЧНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

**_А. У. Ерашэвіч_**

*Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт,*
*пр. Партызанскі, 26, 220070, г. Мінск, Беларусь, erash06@rambler. ru*

На аснове навуковых дасягненняў некаторых вядучых расійскіх і беларускіх гісторыкаў-метадолагаў прыведзены разважанні аб месцы і ролі ў сучасных гістарычных даследаваннях універсальных прынцыпаў аб’ектыўнасці, гістарызму, сістэмнасці, узаемадапаўняльнасці, каштоўнаснага падыходу як асновы вывучэння гістарычнай рэчаіснасці. Раскрыты эўрыстычныя магчымасці выкарыстання прынцыпаў гістарычнага пазнання пры вывучэнні праблем бюджэтнай палітыкі Расійскай імперыі на тэрыторыі беларускіх губерняў у канцы XVIII – першай палове XIX ст.

***Ключавыя словы:*** прынцыпы гістарычнага пазнання; аб’ектыўнасць; гістарызм; сістэмнасць; узаемадапаўняльнасць; каштоўнасны падыход; Расійская імперыя; беларускія губерні; бюджэтная палітыка.

# НЕКОТОРЫЕ ЗАМЕЧАНИЯ О ПРИНЦИПАХ НАУЧНОГО ИСТОРИЧЕСКОГО ИССЛЕДОВАНИЯ

**_А. В. Ерошевич_**

*Белорусский государственный экономический университет,*
*пр. Партизанский, 26, 220070, г. Минск, Беларусь, erash06@rambler. ru*

На основе научных достижений некоторых ведущих российских и белорусских историков-методологов представлены размышления о месте и роли в современных исторических исследованиях универсальных принципов объективности, историзма, системности, взаимодополняемости, ценностного подхода как основы изучения исторической действительности. Раскрыты эвристические возможности использования принципов исторического познания при изучении проблем бюджетной политики Российской империи на территории белорусских губерний в конце XVIII – первой половине XIX в.

***Ключевые слова:*** принципы исторического познания; объективность; историзм; системность; взаимодополняемость; ценностный подход; Российская империя; белорусские губернии; бюджетная политика.

# SOME REMARKS ON THE PRINCIPLES OF SCIENTIFIC HISTORICAL RESEARCH

**_A. V. Yerashevich_**

*Belarusian State Economic University,*
*Partyzanskaja Avenue, 26, 220070, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: A. V. Yerashevich (erash06@rambler. ru)*

Based on the scientific achievements of some leading Russian and Belarusian historians and methodologists, reflections on the place and role in modern historical research of the universal principles of objectivity, historicism, consistency, complementarity, value approach

as the basis for studying historical reality are presented. The heuristic possibilities of using the principles of historical cognition in studying the problems of the budgetary policy of the Russian Empire on the territory of the Belarusian provinces at the end of the XVIII – first half of the XIX century are revealed.

***Key words:*** principles of historical knowledge; objectivity; historicism; consistency; complementarity; value approach; Russian Empire; Belarusian provinces; budgetary policy.

Прынцыпы – гэта метады мыслення, базавыя патрабаванні, фундаментальныя палажэнні і прыёмы даследчыцкай дзейнасці, якія вызначаюць асноўныя спосабы вырашэння навуковых праблем. Сярод метадолагаў гістарычнай навукі няма адзінства поглядаў наконт колькасці і трактоўкі сутнасці прынцыпаў гістарычнага навуковага даследавання. У сучаснай гістарычнай навуке адзначаюць наяўнасць прынцыпу гістарызму (спасціжэнне развіцця індывідуальных, непаўторных з’яў у іх развіцці, да яго адносіцца і прынцып развіцця) і супрацьборствуючага яму з сярэдзіны XX ст. прынцыпу цэласнасці (халізму) (зводзіцца да выяўлення ўстойлівых сувязей, пастаянных з’яў, стабільных працяглых структур). Гэтыя погляды ў другой палове XX ст. дапоўніліся прынцыпамі дадатковасці, дыялогу (гісторык не мае права «судзіць», а павінен весці дыялог з мінулым з улікам сучасных сацыякультурных каштоўнасцей), а таксама прынцыпам каштоўнасных адносін (аксіалагічнай ацэнкі) (уключае актуальнасць, разнавіднасць – прынцып партыйнасці) пры адмове прынцыпу аб’ектыўнасці як мэты любой навукі [5; 7] з дадаткам універсальных прынцыпаў дэтэрменізму і сінергетычнага [10, с. 418–419]. У навучальных дапаможніках па метадалогіі гісторыі згадваюць такія прынцыпы гістарычнага пазнання (нормы даследавання), як аб’ектыўнасць, гістарызм, партыйнасць ці каштоўнасны падыход, сістэмны [4, с. 142–159; 3, с. 193–208; 8, с. 56–68; 1, с. 13–15].

У артыкуле пададзены разважанні адносна вопыту выкарыстання прынцыпаў навуковага гістарычнага даследавання пры вывучэнні пытанняў бюджэтнай палітыкі Расійскай імперыі на тэрыторыі беларускіх губерняў у канцы XVIII – першай палове XIX ст. Тэарэтыка-метадалагічнай асновай аўтарскай працы сталі традыцыйныя навуковыя прынцыпы гістарычнага пазнання: аб’ектыўнасці, гістарызму, каштоўнасных адносін (аксіалагічнай ацэнкі), узаемадапаўняльнасці, сістэмны (з улікам міждысцыплінарнасці і шматфактарнасці) падыходы.

Прынцып аб’ектыўнасці азначае імкненне да атрымання верагодных навуковых гістарычных ведаў аб’ектыўнай мінулай сацыяльнай рэчаіснасці, адэкватную інтэрпрэтацыю фактаў гістарычных крыніц, але яго сэнс тлумачыцца па-рознаму: як набліжэнне да адэкватнасці,

верагоднасці, навуковасці і праўдзівасці. Устаноўка на верагоднасць прадугледжвае адпаведнасць інфармацыі гістарычных крыніц мінулай сацыяльнай рэальнасці, наяўнасць сувязі паміж сцвярджэннямі даследчыка і эмпірычнымі данымі, дысцыплінарны паказчык верагоднасці гістарычных ведаў [9, с. 347–349]. Прынцып адноснай аб’ектыўнасці рэалізуецца шляхам стварэння разнастайнай, поўнай і дакладнай крыніцавай базы даследавання, заключаецца ў living рознабаковым вывучэнні прадмета даследавання, у непрадузятым падыходзе да аналізу вывучаемых пытанняў. Імкненне да адноснай аб’ектыўнасці праяўляецца таксама ў спробе ўсебаковага аналізу і непрадузятай ацэнке праблемы даследавання на аснове параўнання рэпрэзентатыўных звестак розных крыніц, якія захоўваюцца ў архівах і бібліятэках розных краін, і супастаўленні розных трактовак, пазіцый гістарычных з’яў у супярэчлівасці і шматграннасці сітуацый і падзей, працэсаў, з улікам разнастайных поглядаў, якія прысутнічаюць у айчынных і замежных гістарычных даследаваннях вучоных розных краін і эпох.

Асновай даследавання сталі прынцыпы структурна-лагічнага аналізу (структура працы), дыялектычнага матэрыялізму, навукова-крытычнага аналізу і па магчымасці максімальнага аб’ектыўнага разгляду, з улікам крытычных адносін, комплексу гістарычных крыніц і навуковай літаратуры пры прыярытэтнасці фактаў выяўленых і прааналізаваных аўтарам шырокага кола неапублікаваных архіўных і апублікаваных дакументальных матэрыялаў, з дадаткам комплекснага выкарыстання розных навуковых падыходаў і метадаў вывучэння, верагоднага аналізу сабранай інфармацыі. Меркаванні і высновы працы фармулююцца на аснове адбору, комплекснага і супастаўнага аналізу, лагічнай інтэрпрэтацыі, усебаковага асэнсавання і тэарэтычнага абагульнення сукупнасці навукова-гістарычных фактаў, з улікам суадносін розных пунктаў гледжання, пазіцый аўтараў на вывучаемыя мінулыя падзеі і працэсы, дадзеныя ў працах вучоных розных галін сацыяльна-гуманітарных навуковых ведаў. Адзначым, што не ва ўсіх навуковых даследаваннях высновы строга адпавядаюць колу сфармуляваных да разгляду пытанняў і фактычнаму зместу прац. Па магчымасці пазбягаючы дагматычных ацэнак, палітызаванай і ідэалагічна ангажыраванай інтэрпрэтацыі навукова-гістарычных фактаў, на аснове поўнага, усебаковага і крытычнага аналізу ўсёй сукупнасці фактычнага матэрыялу комплексу навукова-гістарычных фактаў першакрыніц аўтар паспрабаваў выявіць дынаміку і асаблівасці працэсу станаўлення, функцыянавання і

развіцця дзяржаўных фінансаў на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.

Трэба заўважыць, што прыхільнікі прагматычнага гістарычнага рэлятывізму (асобная сацыяльная група, альбо прадстаўнікі пэўнага пакалення з сваімі каштоўнаснымі арыенцірамі) ствараюць сімвалічна-традыцыйны канчатковы вобраз ідэальнага мінулага, на які абапіраюцца для дасягнення сваіх групавых прагматычных патрэб і інтарэсаў з мэтай фарміравання скажонай мадэлі грамадскай гістарычнай свядомасці. Постмадэрністы сфармуліравалі канцэпцыю «месц памяці» як спосабу ўсведамлення ўласнага сучаснага ў мінулым. Гісторыя – гэта не столькі падзеі мінулага, а адлюстраванне іх у свядомасці сучаснікаў, сімвалічных «месцах памяці», дзе зафіксавана мінулае як суб'ектыўная прэзентацыя сучаснасці. Гісторык павінен займацца тым, што запатрабавана сучаснасцю, праецыраваць сучасныя ідэі, сацыяльныя і эканамічныя праблемы, меркаванні гістарычных суб'ектаў пры трактоўцы з'яў шматварыятыўнага мінулага.

Прынцып гістарызму, які быў сфармуляваны ў пачатку XIX ст., прадугледжвае разгляд аб'екта даследавання і зместу вывучаемага прадмету мінулай гістарычнай рэчаіснасці як сукупнасці зменлівых у часе з'яў і працэсаў у кантэксце эпохі, як цэласнай сістэмы, якая ўзнікае ў пэўных умовах у выніку дзеяння адпаведных прычын і з часам набывае незваротныя змены, у ходзе якіх рэалізуюцца некаторыя тэндэнцыі і ствараюцца розныя перспектывы развіцця аб'ектаў у далейшым. Як правіла, гісторык заўважае змены і параўноўвае стан аб'екта даследавання ў часе, альбо ў пачатку і ў канцы вывучаемага перыяду. У адпаведнасці з спецыфікай умоў з'яўлення і функцыянавання гістарычных крыніц, сутнасць прадметаў, падзей у беларускіх губернях Расійскай імперыі асвятляецца ў ходзе і ў кантэксце (сувязі) з абумоўленымі шматлікімі канкрэтна-гістарычнымі ўмовамі, фактарамі, абставінамі іх фарміравання, станаўлення і развіцця ў часе і прасторы (асабліва важна вызначыць ступень уплыву і суадносіны сацыяльных, эканамічных, палітычных, ідэалагічных, культурных фактараў). Важна ўлічваць залежнасць пераўтварэнняў ад змен прыярытэтаў палітыкі афіцыйнай улады, ступені яе рэалізацыі ў сацыяльнай практыке тагачаснага грамадства, ад пануючых уяўленняў, каштоўнасных арыенціраў, ментальных стэрэатыпаў свядомасці людзей пэўнага перыяду. Задача гісторыка – выяўленне і апісанне максімальна поўнага набору, сукупнасці вылучаных ім адзнак даследавання. Сістэмны разгляд спецыфічных і шматфункцыянальных

падзей у сукупнасці і дынаміке, а таксама ўзважанае вывучэнне працэсу развіцця з'яў абумоўліваюць неабходнасць іх усебаковага аналізу ў функцыянальнай узаемазвязанасці, узаемазалежнасці, ўзаемасувязі (каўзальныя сувязі) і прычыннай ўзаемаабумоўленасці (дэтэрмінаванасці). Згодна канонаў класічнага гістарызму гісторык павінен «пагрузіцца» ў эпоху, каб рэканструіраваць падзеі так, як бачылі іх сучаснікі. Прыхільнікі неакласікі небеспадстаўна лічаць, што сучасны гісторык мае значную перавагу па ўзроўні з сведкамі мінулых падзей: ён, як правіла, з пазіцый сучасных ведаў і рэфлэксійных прыёмаў ведае, якое месца, роль і значэнне займалі пэўныя гістарычныя падзеі, працэсы, персанажы адносна іх грамадскай значнасці, тэндэнцый ці заканамернасцей развіцця, вынікаў, наступстваў. Яны трактуюць гістарычны працэс як сувязь паміж неізаляванымі падзеямі ў часе, падзяляюць пункт гледжання аб спецыфічных, унікальных сацыякультурных каштоўнасцях і своеасаблівасцях кожнай эпохі. Да таго ж, гісторык павінен не толькі зафіксаваць гэтыя адрозненні, але і паспрабаваць растлумачыць іх. Такім чынам, прынцып гістарызму датычыцца і аб'екта пазнання, і суб'екта пазнавальнай дзейнасці [9, с. 150–151]. Не менш значнай праблемай выступае карэктны перавод рэтраспектыўнай гістарычнай інфармацыі на сучасную мову з улікам выкарыстання адэкватнага паняційна-катэгарыяльнага апарату і інш.

Такім чынам, эўрыстычныя магчымасці навуковага дыялектыка-матэрыялістычнага гістарызму зводзяцца да канцэнтрацыі ўвагі на ідэі адзінства, пераемнасці, паступальнасці, выяўленні тэндэнцый працэсу развіцця з вызначэннем яго перыядаў на аснове аб'ектыўных заканамернасцей, паказу якасных асаблівасцей на розных стадыях, разгляду грамадскіх з'яў і працэсаў, сацыяльных структур, якія ўзнікаюць і зменьваюцца, у іх генезісе, канкрэтна-гістарычнай абумоўленнасці, сувязі з іншымі з'явамі і ўмовамі эпохі, функцыянальнай узаемасувязі і прычыннай узаемаабумоўленасці, самакаштоўнасці, унікальнасці (індывідуальнасці, напаўторнасці, своеасаблівасці, разнастайнасці).

Гістарызм нацэльвае даследчыка на пошук вывучэння актуальнай для сучаснасці тэмы, паколькі праз трактоўку мінулых аб'ектаў тлумачацца сучасныя з'явы і працэсы, а сучаснасць прадвызначае пункт гледжання на мінулае для разумення ўрокаў, выкарыстання вопыту для магчымасці выяўлення аддаленых вынікаў вывучаемых аб'ектаў, вызначэння прыярытэтаў далейшага развіцця. Важна падкрэсліць, што важна не столькі выявіць у рэтраспекцыі падзеі, якія адбыліся, але і вывучаць

незавершанае мінулае як сферу дзеяння, выбару і рызыкі. Антрапалагічны гістарызм зводзіцца да таго, што ажыццяўляецца пошук сучаснага сябе праз устанаўленне умоўных кантактаў з іншымі гістарычнымі эпохамі, раскрываецца і выяўляецца своеасаблівасць мінулай рэчаіснасці [2, с. 8, 9, 10].

Аўтар паспрабаваў пазбегнуць супрацьлеглага гістарызму прынцыпу прэзентызму, альбо поўнага асучасвання гістарычнага мінулага ў працэсе яго пазнання, калі ўяўленні мінулага замацоўваюцца ў сучасных паняццях, вобразах, сімвалах, міфах, стэрэатыпах, разглядаюцца з пазіцый сучаснасці, а яе ідэі распаўсюджваюцца на мінулае. Вытокі і наступствы падзей канца XVIII – першай паловы XIX ст. праходзілі ў іншых сацыякультурных умовах гістарычнай просторы і часу, чым цяпер. Пры класіфікацыі і тыпалагізацыі, а асабліва пры ўжыванні сучасных сацыяльна-эканамічных тэрмінаў аўтар высвятляў і параўноўваў, якое сэнсавае значэнне яны мелі ў мінулым і ў сучаснасці. Неабходна ўносіць карэктывы ў эканамічныя паняцці, формы якіх былі рознымі з пункту гледжання сучаснай трактоўкі іх сутнаснага сэнсавага зместу (прыклад, банкі).

Каштоўнасны прынцып [6] уключае аксіалагічны кампанент у выяўленні і ацэнке індывідуальна значнага ў вывучаемым аб’екце з пункту гледжання нейкіх ідэалаў і норм, хоць непрадузятасць уласных адносін, суб’ектыўных сімпатый і прыхільнасцей гісторыка-вучонага да навукова-гістарычных фактаў не заўсёды дасягае жаданай мэты. Важны аб’ектыўныя крытэрыі суб’ектыўнай ацэнкі падзей і працэсаў мінулага з улікам сучаснай сістэмы сацыяльных каштоўнасцей, ідэалаў, інстытутаў, норм паводзін, каштоўнасных арыентацый, інтарэсаў дзяржавы і грамадства і інш. Ацэнка аб’ектаў гістарычнай рэальнасці, як і вылучэнне крытэрыяў у працэсе адбору і ранжыравання навукова-гістарычных фактаў, можа праводзіцца зыходзячы з наяўнасці розных светапоглядных асноў, суб’ектыўных матываў, патрэб, інтарэсаў, адзнак праграм развіцця, сістэмы каштоўнасных арыенціраў чалавека, сацыяльнай групы, грамадства, дзяржавы, ментальных установак і стэрэатыпаў. Існуе мноства крытэрыяў ацэнкі гістарычных аб’ектаў, з’яў, працэсаў, персанажаў: рэлігійны, духоўна-маральны (этычны), эстэтычны, эмацыянальны, прававы, палітычны, ідэалагічны, этнічны, лагічны і г. д. Пры ўспрыманні падзей і асоб беларускай мінуўшчыны пры пераходзе ад традыцыйнага аграрнага да індустрыяльнага грамадства магчыма выкарыстанне такіх мерак, як ступень прафесіяналізму асоб, вызначэнне ступені значнасці іх

дзейнасці (перашкаджалі, садзейнічалі, не ўплывалі на напрамкі сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і культурна-духоўнага развіцця грамадства), узровень матэрыяльнага дастатку людзей (павышэнне ўзроўню і якасці іх жыцця), праявы і маштабы дамінавання польска-расійскіх культурна-цывілізацыйных уплываў, вызначэнне прыярытэтных мэт і задач, сродкаў ажыццяўлення і вынікаў сацыяльна-эканамічнага развіцця і інш. Прынцып сапраўднай партыйнасці арыентуе гісторыка на ідэйна-палітычныя каноны з улікам адстойвання палітычных ці сацыяльных каштоўнасцей.

Аўтар прытрымліваўся прынцыпу статыстычнай ацэнкі сацыяльна-эканамічных падзей і працэсаў з улікам усёй сукупнасці знойдзеных і прааналізаваных навукова-гістарычных фактаў у іх узаемаабумоўленасці і супярэчнасці. Пры аналізе складаных з'яў і працэсаў фінансавай гаспадаркі аўтар зыходзіў з прынцыпу статыстычнай ацэнкі пры дапамозе пераважна такой дакладнай і надзейнай колькаснай меры вымярэння як грошы.

Сістэмны падыход уключае групу метадаў, з дапамогай якіх праблема разглядаецца на базе міждысцыплінарнага сінтэзу методык розных галін навуковых ведаў, дапускае злучэнне аналізу і сінтэзу, колькасных і якасных характарыстык аб'ектаў для выяўлення механізму і інструментаў іх станаўлення і развіцця ва ўсёй шматбаковасці і супярэчнасці. На аснове вывучэння нескажоных і не падагнаных пад пэўныя схемы і канцэпцыі навукова-гістарычных фактаў, падзеі і працэсы разглядаюцца не паасобку, а цэласна ва ўзаемасувязі з іншымі, ва ўзаемаўплыве складаючых элементаў, з выяўленнем аб'ектыўных заканамернасцей і вызначэннем канкрэтных напрамкаў дзейнасці, а праблема – комплексна і ўсебакова ў шматграннасці і супярэчлівасці.

Выкарыстанне эўрыстычных магчымасцей сістэмнага падыходу заключаецца ў тым, што аналіз сацыяльна-эканамічных з'яў у працэсе іх развіцця ў цэлым і бюджэтнай палітыкі расійскага царызму, ў прыватнасці, праводзіцца з улікам уздзеяння на ніх у пэўнай ступені разнастайных умоў і ўплыву спектра шматлікіх фактараў (шматфактарнасць) у кантэксце развіцця галін эканомікі (сельская гаспадарка, прамысловасць, гандаль, фінансава-крэдытная сістэма, шляхі зносін і сродкі сувязі) разам з эвалюцыяй сацыяльных інстытутаў, сфер, структур (трансфармацыя саслоўнай структуры грамадства, змены ў колькасці, складзе і тэрытарыяльным размяшчэнні народанасельніцтва, працэсы гарызантальнай і вертыкальнай сацыяльнай мабільнасці,

паказчыкі ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва і інш.), сацыякультурнымі зменамі ў менталітэце і інш. Метадалагічнымі прынцыпамі выступае ўлік у рэканструіруемых сацыяльна-эканамічных працэсах супярэчлівых сувязей аб'ектыўнага (узровень сацыяльна-эканамічнага развіцця, патрабаванні і інтарэсы асобы, пэўных сацыяльных груп, дзяржавы і грамадства, мінулыя традыцыі) і суб'ектыўнага (стратэгічныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі, пазіцыі ўладных структур, настроі і інтарэсы адміністрацыйнай эліты) пачаткаў. Праведзены структурна-функцыянальны (сістэмны) разгляд бюджэтнай палітыкі як сукупнасці арганізацыйных структур, узаемадзейніючых паміж сабою інструментаў, якія прадстаўляюць цэласную складаную дынамічную сістэму. Сістэмны падыход праяўляецца і ў тым, што фінансавыя рэсурсы разглядаюцца ў працэсе іх фарміравання, размеркавання, пераразмеркавання, выкарыстання і кантролю за іх зборам і выдаткоўваннем. Былі вылучаны структура і функцыі фінансава-падатковай сістэмы. У працы дадзена канцэптуальнае абгрунтаванне мадэлям фінансавага забеспячэння розных сфер жыццядзейнасці грамадства.

Зыходны прынцып сістэмнасці мае на ўвазе тое, што рэканструкцыя цэласнага складанага аб'екту (сістэмы) павінна праводзіцца з улікам яе як сукупнасці выяўленых і ацэненых розных па тыпах і інтэнсіўнасці кантактаў і зносін узаемазвязаных шматузроўневых, рознамаштабных кампанентаў (элементаў і падсістэм). Сістэма мае ўваход (рэсурсы) і выхад (мэта), сувязь з знешнім асяроддзем (фізічнымі, біялагічнымі, сацыяльнымі, духоўнымі аб'ектамі, якія непасрэдна ці праз кампаненты сістэмы ўздзейнічаюць на яе фарміраванне, функцыянаванне і развіццё, узаемадзеянне з іншымі сістэмамі), зваротную сувязь. Любой сацыяльнай сістэме ўласцівы такія характэрныя рысы, як цэласнасць і збалансаванасць (кожны кампанент сістэмы ўносіць пэўны ўклад у дасягненне агульнасістэмнай мэты), эмерджэнтнасць (новая якасць, якая адсутнічае ў асобных элементах сістэмы як вынік іх узаемадзеяння), структурнасць (адносна устойлівая і ўпарадкаваная ўзаемасувязь і ўзаемадзеянне паміж элементамі, як прынцып яе арганізацыі), іерархічнасць, устойлівасць, адаптыўнасць (пасіўная ізаляцыя ці прыстасаванне да абставін, актыўнае зніжэнне неспрыяльных знешніх уплываў), функцыянальнасць, самаарганізацыя (змены за кошт унутраных крыніц), упарадкаванне (паслядоўная перадача інфармацыі і ажыццяўленне дзейнасці згодна з правіламі ўнутрысістэмных функцый кампанентаў), дзялімасць, адкрытасць (ступень адкрытасці да знешніх кантактаў праяўляецца праз

патокі інфармацыі, людзей, праз перамяшчэнне фінансавых рэсурсаў), зменлівасць. Усе элементы структуры сістэмы маюць пэўны склад, паслядоўнасць арганізацыі і дзейнасці, шматгранныя тыпы сувязей аб'ектаў, унутраныя механізмы функцыянавання. Вывучэнне сацыяльнай сістэмы зводзіцца да характарыстыкі яе мэты (самазахавання, адаптацыі да знешняга асяроддзя, развіцця, дасягнення адзінага сістэмнага выніку), прызначэння (рэалізуемыя сродкі дасягнення дзейнасці сацыяльнай сістэмы і яе кампанентаў), сутнасці (вызначэнне інтэгратыўных якасцей), складу (колькасць і якасная характарыстыка частак), структуры (унутранай арганізацыі, формы ўзаемасувязей кампанентаў і прысутных ім уласцівасцей, іерархіі кампанентаў і сувязей; ад узроўню ўстойлівасці структуры залежыць ступень развіцця і стабільнасць функцыянавання сістэмы), функцый (ступені і спосабы жыццядзейнасці частак і сістэмы ў цэлым), характару ўнутрысістэмных сувязей і адносін, парадку спалучэння структур і функцый (у форме кардынацыі (гарызантальнай узгодненасці дзеянняў) і субардынацыі (вертыкальнай супадпарадкаванасці) на базе адносін улада-загад-падпарадкаванне паміж элементамі адміністрацыйнай іерархіі), выяўлення інтэгратыўных фактараў, механізмаў і інструментаў забеспячэння цэласнасці, узаемадзеяння, удасканалення і развіцця, камунікацый з знешнім асяроддзем і сувязей з больш высока іерархічна арганізаванай сістэмай, крыніцамі яе ўзнікнення, станаўлення, тэндэнцыямі і перспектывамі функцыянавання і развіцця, пераўтварэння ў якасна новую сістэму [1, с. 77–78, 82–83; 9, с. 455–456].

Этап дэкампазіцыі (вычлянення) сістэмы ўключае працэдуры вылучэння ў ёй кампанентаў (элементаў і падсістэм). Адзнака выдзялення сістэмы – наяўнасць мінімальнай колькасці ўзаемадзеянняў паміж падсістэмамі, якія не выконваюць агульнасістэмнай функцыі, а іх функцыі ўвасоблены ў сістэме. Граніца аддзялення падсістэмы – мінімальная колькасць узаемадзеянняў паміж элементамі і сканцэнтраванне функцый у падсістэме [1, с. 81]. Сінтэз сістэмных элементаў адбываецца ў непаўторных і індывідульных сітуацыях, падзеях і працэсах. Метад сістэмнага аналізу дазваляе паказаць працэс дзейнасці якасна цэласных, іерархічна арганізаваных, узаемазвязаных сацыяльных сістэм як механізм узаемаўплыву featuresнапарадкавых фактараў на элементы, мадэліраваць і аналізаваць прычынна-выніковыя і функцыянальныя сувязі паміж кампанентамі шматузроўневай структуры сістэмы, характар узаемасувязей з іншымі сістэмамі больш высокага ўзроўню. Складовай часткай сістэмнага падыходу як метаду даследавання функцыянальнай прыроды і

дынамікі складаных сацыяльных сістэм з’яўляецца структурны (вылучэнне яе спецыфічных уласцівасцей, асаблівасцей, характарыстык) і функцыянальны (паказ месца і функцый у іерархіі сістэм, вызначэнне ролі падсістэм у сістэме) аналіз.

У прыватнасці, у адносінах да вывучэння фінансава-падатковай сістэмы даследчык павінен вызначыць у комплексе складанасць і спецыфіку аб’ектаў яе арганізацыйнай структуры, выявіць асаблівасці пабудовы і характар узаемасувязей паміж інстытутамі, якія вызначаюць ступень цэласнасці сістэмы, устанавіць і правесці аналіз прычынна-выніковых сувязей паміж яе кампанентамі, паказаць функцыі асобных аб’ектаў сістэмы і ўстанавіць ступень выканання належных ім функцый, прааналізаваць характар дамінавання сувязей у сістэме (каардынацыйныя або субардынацыйныя), правесці структурна-функцыянальны аналіз яе дзейнасці, раскрыць механізм яе функцыянавання як вынік узаемадзеяння мясцовых уладных структур, ахарактарызаваць узаемаадносіны сістэмы з вонкавым асяроддзем, суадносіны з сістэмамі больш высокага ўзроўню, правесці рэтраспектыўную ацэнку правільнасці суадносін выбару мэтаў дзейнасці, сродкаў іх рэалізацыі і вынікаў (аднамомантавых і адтэрмінаваных), і ў цэлым высветліць тэмпы (інтэнсіўнасць), напрамак, характар і тып функцыянавання і развіцця сістэмы (прааналізаваць прызначэнне і роль, высветліць ступень відазмянення асобных складаючых элементаў сістэмы, яе структур, падсістэм і функцый у статыке і дынаміке пры захаванні агульнасістэмнай функцыі, ці яе кардынальнай змены) ў сувязі з унутранай палітыкай самаўладдзя на беларускіх землях. Метадалагічная рэфлексія і комплекснае выкарыстанне метадаў дазволілі вылучыць у дыялектычнай узаемасувязі агульныя і спецыфічныя сацыякультурныя фактары і іншыя аспекты функцыянавання і развіцця сістэмы, даказаць адзінства яе структуры і функцый як цэласнага аб’екта.

Ідэя міждысцыплінарнасці заснавана на неабходнасці і магчымасці імпарту канцэптуальных ідэй і дысцыплінарных падыходаў, тлумачальных мадэлей, тэрміналогіі і метадалагічнага інструментарыя іншых галін навуковых ведаў для вырашэння праблем даследавання. Мульцідысцыплінарны падыход (тэхналогія) заключаецца ў прынцыпе ўзаемадапаўняльнасці і прадукцыйнага сінтэзу ўласна спецыяльна-гістарычных метадаў прыёмамі і методыкамі аналізу, запазычаных з іншых навуковых дысцыплін (эканамічная тэорыя, тэорыя і гісторыя

падаткаў і падаткаабкладання, філасофія гаспадаркі, эканамічная сацыялогія, эканамічная паліталогія, рэгіяналістыка і інш.).

Прынцып інтэгральнага ўзаемадапаўнення дзейнічае праз комплекснае поліпарадыгмальнае злучэнне ідэй асноўных гістарыясофскіх, гісторыка-сацыялагічных, макра(мета)гістарычных рэляцівісцкіх канцэптуальных парадыгм і падыходаў.

Комплекснае выкарыстанне, у спалучэнні адзін з іншым прынцыпаў і метадаў гістарычнага даследавання, з улікам іх эўрыстычнага патэнцыялу, гнасеалагічных магчымасцей і абмежаванняў, вобласці рэалізацыі, дазваляюць павысіць якасць гістарычных навуковых прац.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Бочаров А. В. Основные методы исторического исследования: учебное пособие. Томск: Томский государственный университет, 2006.

2. Крыштаповіч Я. А. Традыцыйны і навуковы гістарызм (антрапалагічныя і метадалагічныя праблемы) // Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 1993. № 2. С. 5–11.

3. Методологические проблемы истории: учебное пособие для студентов, магистрантов и аспирантов исторических и философских специальностей учреждений, обеспечивающих получение высшего образования / под общ. ред. В. Н. Сидорцова. Минск: «ТетраСистемс», 2006.

4. Методология истории: учебное пособие для студентов вузов / под ред. А. Н. Алпеева и др. Минск: «ТетраСистемс», 1996.

5. Рамазанов С. П. Принципы исторического познания в XIX–XX вв.: тенденция к оптимизации // Вестник Томского государственного университета. Сер. История. 2009. № 2 (6). С. 47–49.

6. Рамазанов С. П. Проблема ценности в истории: историографические и методологические аспекты. Волгоград, 2006.

7. Рамазанов С. П. Формирование системы методологических принципов исторического познания // Развитие методологических исследований и подготовка кадров историков в Республике Беларусь, Российской Федерации и Республике Польша: сб. науч. ст. / ГрГУ им. Я. Купалы; редкол.: А. Н. Нечухрин (гл. ред.) [и др.]; под науч. ред. А. Н. Нечухрина. Гродно : ГрГУ, 2012. С. 63–66.

8. Сидорцов В. Н. Методология истории: курс лекций для студентов, магистрантов, аспирантов исторических специальностей. Минск: БГУ, 2010.

9. Теория и методология исторической науки. Терминологический словарь / отв. ред. А. О. Чубарьян. М.: Аквилон, 2014.

10. Яскевич Я. С., Лукашевич В. К. Философия и методология науки: учебное пособие для магистрантов и аспирантов. Минск: БГЭУ, 2009.